*Да 125-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа і 40-годдзя заснавання філіяла-музея*

# РОДНЫ КУТ ЯКУБА КОЛАСА

## *(Погляд у мінулае)*

*Я зноў хачу зірнуць назад*
*Пад тыя стрэхі родных хат,*
*Дзе зачалася пуцявіна,*
*Дзяцінства мілага часіна...*
*Дарогі, вечныя дарогі!*
(Я. Колас. «Новая зямля»)

**У** кожнага чалавека ёсць мясціны, якія ў яго памяці жывуць вечна. Праз усё жыццё чалавек праносіць святы вобраз роднай хаты, дзе ён нарадзіўся, узгадаваўся, вырас і пайшоў у самастойнае жыццё. Лёс Якуба Коласа склаўся так, што ў пачатку яго жыццёвага шляху мясцін, дзе прайшло яго дзяцінства і юнацтва, было шмат.

У засценку Акінчыцы пачалося яго жыццё, на Мікалаеўшчынскай і Сухошчынскай (Ласток) лясных каморах прайшлі раннія дзіцячыя гады паэта. Пасля — Альбуць, Нясвіж... Закруціўся жыццёвы вір: пераводы з адной школы ў другую, звальненне з настаўніцкай пасады, два гады следства, праследванне і нагляд паліцыі, тры гады астрога, служба ў запасным батальёне, ваенная школа, тройчы мабілізацыя ў армію, румынскі фронт, і, нарэшце, хваробы...

На фоне гэтага вельмі зразумелымі робяцца радкі: «Даўно мяне цягне свой родны куток, дзе я гадаваўся, вучыўся, дзе правёў свае маладыя леты...»

*(Я. Колас. Публ. і крыт. арт.)*

### АКІНЧЫЦЫ

Акінчыцы... Радзіма класіка беларускай літаратуры, калыска Якуба Коласа. Тут ён упершыню глянуў на свет, сказаў сваё першае слова «мама». Адсюль пачаў ён свой шлях па нялёгкіх жыццёвых пуцявінах — шлях сына сваёй роднай зямлі, выразніка спрадвечных дум і спадзяванняў свайго народа, шлях барацьбы за лепшую долю, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларусаў, шлях да вышынь паэтычнага мастацтва, шлях ад сялянскага хлопчыка ў зрэбнай кашульцы Косціка да генія сусветнай літаратуры Якуба Коласа.

З 1977 года вёска Акінчыцы ўключана ў межы горада Стоўбцы. Яна разраслася ўдоўж і ўшыр і зусім страціла ранейшы воблік старасвецкага шляхецкага засценка.

Што тут было больш за стагоддзе таму назад?

У «Геаграфічным слоўніку каралеўства польскага і іншых краёў славянскіх» ёсць апісанне Акінчыц таго далёкага часу:

«Окінчыцэ, у народнай гаворцы Акінчыцы, некалі пасёлак шляхты Акіньчыцаў, павет Мінскі, у 3-м паліцэйскім стане, Свержанскай валасці, у 4 вёрстах на поўнач ад мястэчка Новы Свержань, пры гасцінцы з Адцэды, мае 9 двароў; мясцовасць роўная, з лёгкай глебай».

Як сведчаць старажылы Акінчыц, родапачальнікам жыхароў быў чалавек па прозвішчы Акінчыц, якому князь Радзівіл за стараннную службу падараваў поле і яго наваколле. Гэты Акінчыц і з'явіўся заснавальнікам паселішча ў некалькі двароў, якія размяшчаліся на адным заходнім баку вуліцы ў рад, ствараючы засценак.

У архіўных дакументах значыцца, што Акінчыцы ў 1656 годзе — паселішча зямян Акінчыцаў, якое ўваходзіла ў Нясвіжскае княства Радзівілаў, а ў 1747 — засценак Мірскага графства, у якім было 5 двароў, 4 з якіх засялялі зямяне па прозвішчы Акінчыцы. З 1793 года Акінчыцы ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Валодаў засценкам Міхал Радзівіл, які абраў сабе ваенную кар'еру — ён быў генералам брыгады

польскага войска, удзельнікам паўстання Тадэвуша Касцюшкі, служыў у польскіх легіёнах Напалеона і г. д. З гэтай нагоды ён не мог удзяляць многа ўвагі кіраванню сваімі памесцямі. Большасць з іх ён здаваў у арэнду. З 1795 па 1800 гады арандатарам Акінчыц быў Аляксандр Машэўскі. Тут было 6 двароў і пражывала 30 жыхароў.

Зручнае размяшчэнне засценка на скрыжаванні старога гасцінца (Кацярынінскага тракта) і дарогі са Стоўбцаў у Мікалаеўшчыну паслужыла нагодай для князя Радзівіла паставіць на гэтым скрыжаванні камору (кантрольна-прапускны пункт), які афіцыйна называўся «Окинчицкая лесная застава Несвижской ординации князя Антона Радзивилла». На гэтай каморы павінен быў жыць і несці службу каморны ляснік, у абавязкі якога ўваходзіла правяраць усе фурманкі з лесам і дрывамі, што вывозіліся па гасцінцы з лясоў князя Радзівіла купцамі і навакольным сялянскім людам. Непадалёку ад каморы на ўзгорку, у прыгожых прысадах з рэдкіх на Беларусі дрэў, стаяў вялікі прыгожы будынак, абнесены агароджай з па-мастацку зробленай брамай, на якой красаваўся ласіны рог. Гэта быў дом і сядзіба пана ляснічага, у ім жа месцілася і канцылярыя лясніцтва. Вось так выглядалі Акінчыцы ў той час, калі ранняй вясною 1 красавіка 1881 года сюды з в. Мікалаеўшчыны перабраўся з жонкай і сынамі Міхал Казіміравіч Міцкевіч і пачаў несці нялёгкую службу лесніка-каморніка.

Паступіць на службу да князя Радзівіла ў той час такім мужыкам-сярмяжнікам, як Коласаў бацька, было не так проста. Князь звычайна прымаў на леснікоўскія пасады дробную шляхту каталіцкага веравызнання, аб чым сведчыць спіс служачых Акінчыцкага лясніцтва на 1884—1885 гады. У гэтым спісе з 22 служачых лясніцтва толькі трое з мужыкоў, астатнія шляхта. Міхалу Казіміравічу ўладкавацца на леснікоўскую службу дапамог выпадак.

Міхалаў брат Яўхім Міцкевіч служыў у Нясвіжы ў замку князёў Радзівілаў. Атрымаў службу конюха ён за тое, што аднойчы на паляванні выратаваў князя, калі на таго напала падраненая мядзведзіца. І вось ён зноў ратуе ўжо слугу князя (кухара-француза), які тапіўся ў возеры. За гэта князь прапанаваў Міцкевічам яшчэ адну службу — пасаду лесніка. Так бацька Якуба Коласа стаў леснікам-каморнікам у Акінчыцах, дзе 3 лістапада 1882 года ў яго нарадзіўся сын — Кастусь. У вершы «На раздарожжы» паэт сведчыць:

Пры шляху шырокім,  
Дзе стаіць камора,  
Я на свет радзіўся  
Пад глухі шум бору,  
Позняю парою,  
Восенню гнілою...

Кастусь быў трэцім сынам у сям'і Міхала і Ганны Міцкевічаў. Пражыў ён у Акінчыцах 5 месяцаў. 1 красавіка 1883 г. бацька атрымаў новае назначэнне на камору ў роднае сяло Мікалаеўшчыну.



*Засценак Акінчыцы. Хата, у якой нарадзіўся будучы паэт.*

## МІКАЛАЕЎШЧЫНА

На правым березе Нёмана, там, дзе ў яго ўцякае рэчка Турчанка, паміж прыгожых палёў і лясоў раскінулася вёска Мікалаеўшчына (у мясцовай гаворцы Мікалаўшчына). Яна знаходзіцца за 90 км ад Мінска і за 12 км ад Стоўбцаў. Мікалаеўшчына на працягу шматвяковай гісторыі была і дварам, і памесцем, і мястэчкам, і сялом. У дакументах архіва князёў Радзівілаў ёсць купчая аб тым, што памесце Мікалаеўшчыну ў 1555 годзе яе ўладальнік Рыгор Юр'евіч Сырпуцэвіч-Осцік прадае князю Лукашу Свірскаму. Пасля смерці Лукаша Свірскага памесце пераходзіць яго сыну Крыштофу Свірскаму, у якога ўвесь час узнікалі спрэчкі з Радзівіламі з-за межаў зямельных уладанняў. Спрэчкі перарасталі ў судовыя працэсы і доўжыліся гадамі. У 1596 годзе Крыштоф Свірскі вырашыў пазбыцца Мікалаеўшчыны і прадае яе за 2000 коп літоўскіх грошаў Мікалаю Крыштофу Радзівілу (Мікалаю Сіротку) — сыну Мікалая Радзівіла Чорнага. Ёсць некалькі меркаванняў пра ўзнікненне назвы вёскі. Адны даследчыкі сцвярджаюць, што менавіта Мікалай Чорны назваў паляўнічую заставу на правым беразе Нёмана сваім імем. Сюды ён часта з панамі прыязджаў на паляванне. З гэтай заставы-будана быццам бы і бярэ пачатак вёска Мікалаеўшчына. Такіх буданоў ставілася многа, і да іх ладзіліся дарогі. Высякалі лес, рабілі прасечаныя лініі, а там, дзе было балота, гацілі гаці. Такія лясныя дарогі называліся Буданскімі лініямі, а месца, дзе стаяў будан, — Будамі. Да нашага часу дарогу з Альбуці, якая выходзіць на шашу Стоўбцы — Мікалаеўшчына, старыя людзі называюць Буданскай. Калі вёску ў 1596 годзе купляе сын Мікалая Чорнага — Сіротка, то ў купчай сказана, што ў памесці 17 двароў, карчма, бровар, прыстань на Нёмане і драўляная Мікалаеўская бажніца — царква. І тут ўзнікае пытанне аб тым, а ці не ад святога Мікалая Цудатворца Мірлікійскага мае назву вёска, тым больш, што яна да 1596 года не належала Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў, а ўжо называлася Мікалаўшчынай. Крыху паразважаем над гісторыяй нашага краю.

У VIII—IX стагоддзях (час Сярэднявечча) пачала ўсталёўвацца старажытнабеларуская дзяржаўнасць, узмацняюцца культурнаэтнічныя працэсы. На тэрыторыю Панямоння пранікаюць летапісныя плямёны дрыгавічоў і балцкіх плямён, пачынаецца хрысціянізацыя. Асабліва хуткімі тэмпамі шырыцца яна на славянскіх землях пасля таго, як у 868 годзе Кіеўскі князь Аскольд прыняў хрысціянства. Ён пачаў будаваць невялікія драўляныя культавыя будынкі. Будаўніцтва цэркваў ішло інтэнсіўнымі тэмпамі, калі ў пачатку X—XI стагоддзяў Кіеўская Русь дасягнула найвышэйшага росквіту, і князь Уладзімір увёў хрысціянства як дзяржаўную рэлігію ў 988—989 гг. А так як амаль усе населеныя пункты раней месціліся паблізу рэк, а рэкі з'яўляліся галоўнымі транспартнымі артэрыямі, па іх ішла сувязь між краямі, то, зразумела, людзі маліліся свайму абаронцу, заступніку і выратавальніку Мікалаю Цудатворцу епіскапу Мірлікійскаму. У народзе яго называлі святым Мікалаем Мокрым, бо ён лічыўся заступнікам тых, хто плаваў і падарожнічаў, малітвамі якога асвячаюцца і цяпер марскія і рачныя судны, а таксама і водныя прасторы.

Што тычыцца асобы святога Мікалая Цудатворца, то гэта быў рэальны зямны чалавек, які пражыў жыццё, несучы людзям дабро і моцную веру ў хрысціянства. Яго ў народзе яшчэ называлі Мокрым Мікалаем Угоднікам — вешчуном дабра і надзеі. Нарадзіўся ён у 284 годзе ў Лікіі — старажытнай краіне на поўдні Малой Азіі, каля горада Міры. За сваю адданасць веры, за змаганне за яе, ён некалькі разоў трапляў у турму. У 325 годзе адбыўся Усяленскі Сабор, удзельнікам якога быў і Мікалай Мірлікійскі. Ён на Саборы выступіў з моцнай крытыкай у бок Арыя, які яму гэтага не дараваў і зрабіў хітрасцю так, што Мікалай зноў трапляе ў турму. Пасля турмы ў яго адкрыўся дар малітвамі вылечваць людзей. Ён рабіў цуды да самай сваёй смерці. За вернасць праваслаўю Мікалай Мірлікійскі атрымаў сан епіскапа, а пасля смерці быў абвешчаны святым. Нятленныя мошчы св. Мікалая Цудатворца адразу захоўваліся ў храме г. Міры, але ў 1087 годзе былі перавезены ў г. Бары (Італія), дзе захоўваюцца да нашага часу.

На тэрыторыі сучаснага Стаўбцоўскага раёна з даўніны было каля дзесятка Міка-

лаеўскіх цэркваў і невялікіх бажніц. Будаваліся яны ў тых населеных пунктах, дзе працякаў Нёман або яго прытокі, у тым ліку і ў Мікалаеўшчыне, адкуль пачыналася суднаходства. Мясцовыя людзі займаліся рачным промыслам: ганялі плыты да Балтыйскага мора, працавалі на сточнях, дзе будавалі віціны, байдакі, каробкі, спускалі іх на ваду і перавозілі розныя грузы. У каробках перавозілі зерне. Капітан каробкі называўся стырнікам. Да нашага часу ў Мікалаеўшчыне існуюць мянушкі, якія характарызуюць прафесіі прадзедаў: Стырнікі, Кавалі, Рафярэнты, Шаўцы, Садавыя, Уланы, Баты (ад назвы грабнога судна — бота).

Хочацца зазначыць, што на тэрыторыі сучаснай Беларусі пачынаючы з сярэдзіны XV і аж да пачатку XVII стагоддзяў у сарака гарадах Беларусі былі Мікалаеўскія цэрквы. У старажытным Полацку іх было дзве. У брэсцкай Мікалаеўскай царкве 9 кастрычніка 1596 года было абвешчана аб стварэнні уніяцкай царквы. У гэтым жа 1596 годзе Мікалаеўшчына (як ужо адзначалася вышэй) была куплена сынам Мікалая Радзівіла Чорнага — Сіроткам, які адыграў значную ролю ў жыцці вёскі і навакольных населеных пунктаў. Ён, у адрозненне ад свайго бацькі, на сваіх землях пачаў усталёўваць каталіцызм. Рабіў ён гэта вельмі актыўна, як бы замольваючы грахі бацькі, які прыкладаў шмат намаганняў, каб увесці уніяцкую царкву, якая б была незалежная ні ад Масквы, ні ад Рэчы Паспалітай. А ў гэты час набраў моц ордэн езуітаў.

Мікалай Сіротка пасля смерці бацькі стаў цалкам падтрымліваць ідэі езуіцтва і ў 18 год (у 1567 годзе) перайшоў у каталікі. Адразу ж у сваіх уладаннях ён стаў таксама ўводзіць каталіцтва. Праваслаўныя або уніяцкія цэрквы і бажніцы перарабляліся ў каталіцкія, а людзей перахрышчвалі. Людзі бунтавалі. Мікалаеўцы папрасілі абароны ў ранейшага гаспадара князя Свірскага, і ён з дружынай нападае на прыхільнікаў князя Радзівіла. На дапамогу Сіротку прыйшоў пан Скарульскі і яго слугі. За гэта князь Радзівіл аддае яму Мікалаеўшчыну ў арэнду на выгадных для Скарульскага ўмовах.

Паміж паселішчам Магільным і Мікалаеўшчынай ёсць мясціна, якая да нашага часу называецца Прыстанькай. На Прыстаньцы быў рум, дзе складавалі драўніну, а пасля звязвалі яе ў плыты і сплаўлялі па Нёмане. Прыстанька была з канца XVI стагоддзя ўласнасцю Рыгора Макарэвіча, але прыглянулася князю Самуэлю Друцкаму, і ён яе выкупляе ў Макарэвіча ў 1602 годзе. У Друцкага не скаліся адносіны з байдачнікамі, і ён перапрадае Прыстаньку з усім рыштункам Мікалаю Сіротку. Сіротка па ўзоры Прыстанькі закладае новы рум (склады драўніны) на другі бок Мікалаеўшчыны на Высокім Беразе Нёмана. Арганізавалася яшчэ адно месца працы, якое аплачвалася грашыма князя Радзівіла. У 1605 годзе Сіротка Мікалаеўшчыну і некаторыя іншыя маёнткі завяшчае свайму сыну Яну Юрыю Радзівілу ў спадчыну пасля сваёй смерці. Але лёс распарадзіўся інакш: Мікалаю Радзівілу прыйшлося адпісваць маёнткі за 6 гадоў да свае смерці, што падарвала зусім яго здароўе, і ён хутка памёр.

Мікалай Сіротка быў вельмі адукаваным чалавекам. Ён займаў вышэйшыя дзяржаўныя, адміністрацыйныя і ваенныя пасады ў ВКЛ, зрабіў г. Нясвіж цэнтрам Нясвіжскай ардынацыі. У 1583—1584 гг. наведаў Блізкі Усход і пасля падарожжа выдаў дзённік, які мае вялікую літаратурную і пазнавальную вартасць і цяпер. Быў граматным палітыкам свайго часу і разумеў, што рэлігійная барацьба адыгрывае згубную ролю ў гісторыі кожнага народа. Разам з Львом Сапегам крытыкаваў і абураўся крывадушнасцю і непаслядоўнасцю караля Жыгімонта Вазы ў адносінах да ліцвінаў. Сіротка падтрымліваў Сапегу ў справе 3-га выдання ў 1588 годзе Статута ВКЛ.

У пачатку XVII ст. у Маскве разгарэлася змаганне за царскі трон. Пасля забойства царэвіча Дзімітрыя (сына Івана Жахлівага — Грознага) царом Масковіі стаў Барыс Гадуноў. Але супраць яго выступіла апазіцыйна настроенае маскоўскае баярства на чале з палітычным авантурыстам—самазванцам збеглым манахам Чудава манастыра Грышкам Атрэп'евым, які выдаваў сябе за царэвіча. Гэтая палітычная ідэя была падтрымана каталіцкімі коламі Рэчы Паспалі-тай, у тым ліку і сынам Мікалая Сіроткі — Янам Юрыем Радзівілам, які вельмі быў зацікаўлены ва ўмацаванні ўлады Дзімітрыя праз яго нявесту, таксама палітычную авантурыстку,

Марыну Мнішак, з бацькам якой ваяводам Юрыем Мнішакам Радзівілы і Сапегі былі добра знаёмыя. Па дарозе з Польшчы ў Маскву Мнішак начавала ў Радзівілаўскім Двары ў Мікалаеўшчыне 1 красавіка 1606 года, а Ілжэдзмітрыем быў выдадзены з гэтай нагоды такі царскі загад: «Вказываю загатить гать у д. Николаевщизны дабы невесте моей хорошо ехать было».

У 1610 годзе праходзіў адзін з самых скандальных судовых працэсаў у гісторыі ВКЛ. Радзівілы судзіліся з кіеўскім ваяводаю Канстанцінам Астрожскім з-за некаторых сваіх маёнткаў. Гісторыя была такая: старэйшы сын М. Сіроткі, Ян Юрый не прыслухоўваўся да парад свайго бацькі, за што ледзь не страціў свае лепшыя маёнткі ў Міры, Мікалаеўшчыне, Свержані і ў Магільным, развіццё якіх ішло хуткімі тэмпамі і прыносіла вялікія прыбыткі. Гісторыя была звязана са шлюбным кантрактам Яна і ўнучкі Васіля Астрожскага Элеаноры. Астрожскія падманам пры заключэнні шлюбнага пагаднення зрабілі так, што Радзівілы гублялі свае вышэйзгаданыя маёнткі. Мікалаю Сіротку прыйшлося пусціць у ход усю сваю кемлівасць, вялікія сувязі і нават пайсці на подкуп суддзяў, каб выйграць суд.

У Мікалаеўшчыне Янам Радзівілам быў пабудаваны ўласны шыкоўны двор на беразе Нёмана. Двор месціўся недалёка ад каталіцкага касцёла св. Мікалая. На правым беразе Нёмана пры пераправе стаяла каля 10 «спіхлераў» (складоў). На другім беразе быў млын, мука з якога шла на экспарт.

У гэты час вялася зацятая палітычная і канфесійная барацьба паміж Рэччу Паспалітай і Масковіяй, якая вылілася ў крывавую вайну за Смаленск. Сын караля Польшчы Жыгімонта Вазы Уладыслаў IV ў лютым месяцы 1610 года быў абвешчаны рускім царом. З гэтым не мог пагадзіцца род Раманавых. Пачалася вайна паміж Польшчай і Масквою за рускі трон. У 1613 годзе маскоўцы выбралі Міхаіла Раманава царом. Уладыслаў, які быў абраны раней, паддавацца не хацеў. Да 1618 года ішло ваеннае супрацьстаянне Рэчы Паспалітай з Масквою. Пляліся інтрыгі, распрацоўваліся розныя планы ў барацьбе за ўладу.

Мікалаеўшчына таксама не была ўбаку ад гісторыі.

У 1617 годзе Ян Юрый Радзівіл сустракаў у сваім багатым Мікалаеўскім двары Уладыслава IV. Абмяркоўваліся планы часовага міру паміж Масквою і Польшчай, які і быў заключаны ў 1618 годзе. Паводле гэтага пагаднення, Смаленскія, Ноўгарадскія, Невельскія і іншыя землі ўвайшлі ў склад ВКЛ, але жаданага спакою не надышло.

З поўдня на тэрыторыю ВКЛ пастаянна рабілі набегі орды татараў і туркаў. З поўначы вясной 1625 года шведскі кароль Густаў-Адольф пачаў акупацыю княства Літоўскага. Вайна цягнулася да восені 1629 года. У верасні гэтага года ў Альтмарку быў падпісаны мір са Швецыяй. У 1626 годзе памірае Ян Юрый Радзівіл. Па спадчыне Мікалаеўшчына пераходзіць Альбрэхту Уладыславу Радзівілу, які гэтае памесце стаў здаваць у арэнду пану Караткевічу з заданнем пабудаваць недалёка ад Мікалаеўшчыны заставу Сямёнаўкі. У1632 годзе застава была пабудавана.

У гэтым жа годзе каралём Рэчы Паспалітай стаў вышэйзгаданы Уладыслаў IV. Ён зноў гасцюе ў княжыцкім Мікалаеўскім двары ў новага гаспадара Альбрэхта Радзівіла. На заставе Сямёнаўкі магнаты палююць на дзікоў. У сваіх мемуарах Альбрэхт згадвае аб амбіцыях Уладыслава, раіць яму адмовіцца ад правоў на Маскоўскую вярхоўную ўладу, што той хутка і зрабіў, як сведчыць гісторыя, але вырашыў яшчэ паваяваць з Масквой. Вайна ішла з 1632 па 1634 гады без ніякай карысці для Уладыслава. Беларусь руйнавала 32-тысячнае Маскоўскае войска. Пры падпісанні пагаднення аб міры ён афіцыйна ануляваў свае правы на Маскоўскі трон.

У 1635 годзе Альбрэхт Радзівіл вырашыў зрабіць рэвізію ў некаторых сваіх уладаннях. Справы ў Мікалаеўскім памесці ішлі добра. У мястэчку было 114 двароў, рынак, гасціны двор, ратуша, касцёл, пяць вуліц: Уздзенская, Дворная, Мастовая, Мінская, Тыльная. Праз Нёман быў мост, на беразе стаяла 13 спіхлераў-складоў, дзейнічаў млын. Было многа рамеснікаў і гандляроў. Судны (віціны, байдакі, каробкі) хадзілі з таварамі за мяжу ажно да Караляўца ў Прусію, цяпер гэта г. Калінінград. Купцы Багдан Мікалаевіч, Сымон Маляўка, Ваўрынец Руткоўскі прывозілі ў Мікалаеўшчыну соль, селядцы, шкло, розныя тканіны.

Альбрэхт Радзівіл, задаволены арандатарам Караткевічам, даў яму ўчастак лесу для выкарчоўвання і права на будоўлю фальварка Сямёнаўкі, а Мікалаеўшчыну адпісаў па спадчыне Аляксандру Людвіку Радзівілу. Людвіку Караткевіч не спадабаўся, і Мікалаеўшчыну ён здае ў арэнду ў 1636 годзе пану Габэцкаму. Да 1641 года Габэцкі валодае вёскай, спраўна плаціць Радзівілам арэнду, але пасля палічыў, што ён ужо мае правы на Мікалаеўшчыну як на сваю ўласнасць, і пачынае судзіцца з Радзівіламі. Навагрудскі суд адсуджвае ў яго вёску на карысць Радзівілаў.

У палове XVII ст. зноў пачаліся войны паміж Масквою і ВКЛ. У дадатак у чэрвені 1655 года і Швецыя ўступіла ў вайну з Рэччу Паспалітай.

Не абмінула вайна і роднае сяло Якуба Коласа. У 1664 годзе маскоўскія войскі знішчылі двор, спалілі ўсю Мікалаеўшчыну з касцёлам св. Мікалая, разбурылі прыстань і мост. На месцы некалі ажыўленага паселішча засталіся папялішчы.

Але мікалаеўцы аказаліся жыццялюбамі. Ужо ў 1669 годзе ў вёсцы адбудавалася 20 двароў. Вярталіся з маскоўскага палону былыя жыхары Мікалаеўшчыны і пачыналі жыццё з будаўніцтва жытла. У1700 годзе паселішча налічвала ўжо 63 двары. Праз Нёман быў пабудаваны драўляны Калінавы мост даўжынёй у адну вярсту з чвэрцю.

З пачатку XVIII стагоддзя Мікалаеўшчынай валодае Ганна Радзівіл. Яна вырашыла пабудаваць гуту на выспе каля Мікалаеўшчыны. Але шкляны завод быў разбураны шведамі, ішла руска-шведская вайна. Гуту Ганна Радзівіл пераносіць у Налібокі, а Мікалаеўшчыну адпісвае сыну Міхаілу Казіміру Радзівілу па мянушцы Рыбанька. Пры ім род Радзівілаў набыў вялікія багацці і палітычную вагу, з якімі не мог параўнацца ніводны магнацкі род ВКЛ. У радзівілаўскіх уладаннях пачынаюць дзейнічаць розныя прамысловыя прадпрыемствы: цагельні, бровары, кавальскія, ганчарныя, дрэваапрацоўчыя, фаянсавыя і іншыя мануфактуры.

У Мікалаеўшчыне ўзнікае цагельня. На другім беразе Нёмана была пабудавана суконная мануфактура, якая мела назву Паласня. У Будах каля Мікалаеўшчыны пачала дзейнічаць Смалярня.

Міхал Рыбанька часта рабіў паляўнічыя наезды ў наваколлі Мікалаеўшчыны. У сваім «Дыярыушы» ён нават апісаў паляванне на мядзведзя: «...мелі мы за Нёманам аблаву, і жонка мая з фузіі смяротна параніла мядзведзіцу, каторую ў сецях дабілі...» Жонка Міхала Рыбанькі, Уршуля Францішка Радзівіл, была вельмі адукаваная жанчына. Яна арганізавала першыя тэатры, была паэтэсай, перакладчыцай і вельмі смелай жанчынай.

Па спадчыне Мікалаеўшчына ад Рыбанькі пераходзіць яго сыну Каролю Станіславу Радзівілу, якога звалі Пане Каханку. Ён быў праціўнікам караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, фаварыта расійскай царыцы Кацярыны II. Пачалася барацьба за ўладу. Пане Каханку быў вымушаны эмігрыраваць. Яго ўладанні (у тым ліку і Мікалаеўшчына) былі забраны расійскай дзяржавай. З эміграцыі Пане Каханку вярнуўся праз 4 гады. Кацярына II вяртае яму яго ўладанні, але ён хутка памірае. Перад смерцю сваю спадчыну ён перадае сыну Міхалу, які ўсё жыццё прысвяціў вызваленню роднага краю. Быў удзельнікам нацыянальна-вызваленчага паўстання Тадэвуша Касцюшкі, служыў у польскіх легіёнах Напалеона, у час паўстання 1830—1831 гг. кіраваў польскай арміяй. Амаль усе свае памесці здаваў у арэнду.

Пасля смерці Міхала Радзівіла ў 1850 г. в. Мікалаеўшчына адыходзіць двум братам Вільгельму і Багуславу, якія лічылі, што самае лепшае багацце — лясы. Многа ўвагі яны ўдзялялі арганізацыі лясной справы: будавалі новыя лясніцтвы, кантрольна-прапускныя пункты драўніны, лесніčоўкі. Былі праціўнікам вяртання насельніцтва ў праваслаўную веру.

З часу другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе царскі ўрад актыўна праводзіў «воссоединение» сялян з «истинной верой» цэлымі ваколіцамі. Мікалаеўцы прыкінулі, што пэўна лепш «добраахвотнае» перахрышчванне, чым па этапе ўсёй вёскай у Сібір. Перахрышчванне сялян у Мікалаеўшчыне адбылося ў 1866 годзе. Для дапамогі ў акцыі духоўным айцам быў выдзелены ўзвод казакаў. Аб гэтых падзеях на тэрыторыі Беларусі ў паэме «Сымон-музыка» Якуб Колас пісаў:

Родны край! У божа імя,
У чэсць касцёлаў і царквоў
Паміж дзеткамі тваімі
Многа легла камянёў.
Многа выйшла трасяніны —
Меч, агонь знішчалі край;
З двух бакоў «айцы» дубінай
Заганялі нас у рай.

*(Я. Колас. «Сымон-музыка»)*

Хаця Якуб Колас нарадзіўся не ў Мікалаеўшчыне, але яе ён заўсёды называў «маё роднае сяло». З Мікалаеўшчыны карані паэта. Тут жылі яго прадзеды па бацькоўскай і па мацярынскай лініях. Вось чаму ў многіх творах ён апісвае родную вёску, а яе насельнікаў робіць прататыпамі сваіх твораў. Напрыклад, у трылогіі «На ростанях» Якуб Колас падае Мікалаеўшчыну пад назвай Мікуцічы:

«Мікуцічы — сяло вялікае, вядомае ва ўсёй акрузе. Стаіць на пясках каля Нёмана. Народ тут бедны, малазямельны...» Так, пасля адмены прыгоннага права ў 1861 годзе мала хто з мікалаеўцаў атрымаў абяцаны поўны надзел з 12 дзесяцін зямлі. Гэтыя надзелы здрабнелі з прычыны таго, што дзяліліся бацькам па спадчыне паміж сынамі. У 1863 годзе сяляне Мікалаеўшчыны самавольна высеклі лес князя Радзівіла ва ўрочышчах Сумесных, Амшанах, Будах, Студзянцы і Канцывалоках на плошчы ў 74 дзесяціны. Пачаўся судовы працэс, які цягнуўся 19 гадоў да 1879 года. Прысуд быў на карысць мікалаеўцаў. У 1876 г. ўся Нясвіжская ардынацыя пераходзіць ва ўладанне сына Вільгельма Радзівіла XIII ардынату Антону Вільгельмавічу Радзівілу, які многа ўвагі ўдзяляў развіццю Мікалаеўшчыны. Паводле перапісу 1897 года, у вёсцы было 141 двор, 935 жыхароў. Асноўным заняткам жыхароў былі нарыхтоўка і сплаў лесу.

Тут і пачынаў свой жыццёвы шлях малазямельнага селяніна бацька паэта Міхал Казіміравіч Міцкевіч:

Міхал, як толькі ажаніўся,
Тады ж ад бацькі аддзяліўся,
Бо стала цесна. З той прычыны
Хадзіў на сплаў ён, на віціны,
Разоў са два схадзіў у прусы —
Куды не трапяць беларусы?
Але абрыдла гэта справа
І адвярнуўся ён ад сплава;
Пайшоў на службу таўкануцца,
Бо дома недзе разгарнуцца.

*(Я. Колас. «Новая зямля»)*

Мікалаеўшчына — другое месца працы бацькі Я. Коласа. На Мікалаеўскай каморы



*Ласток, сяліба лесніка, бацькі Якуба Коласа.*



*Леснічоўка Альбуць. «Родны кут» вялікага песняра.*

ён працаваў леснікам 2 гады: з 1 красавіка 1883 г. да 1 красавіка 1885 года, затым яго пераводзяць у Ласток, або Сухошчыну.

## ЛАСТОК

«Самыя раннія дзіцячыя гады мае, — пісаў Якуб Колас у аўтабіяграфіі, — прайшлі ў Сухошчыне або Ластку. Гэта было глухое месца — поле, навокал лес ды адна толькі сяліба лесніка...» Паводле рэвізскага спісу 1858 года, у Ластку жыў ляснік Франц Сухаверх або, як яго называлі, Сухоцкі. Ад яго і пайшла назва Сухошчына. Памёр Франц Сухаверх у Ластку ў 1872 годзе. Арандатарам фальварка стаў Адам Татур, але да службы адносіўся не вельмі сумленна. З 1884 года арандаваць Сухошчыну стаў палясоўшчык Пятрусь Міцкевіч, а з 1 красавіка 1885 года арандатарам Ластка стаў бацька Якуба Коласа. У паэме «Новая зямля» ў чацвёртым раздзеле «На першай гаспадарцы» паэт апісвае Ласток і згадвае дзядзьку Антося, меншага бацькавага брата, які дапамагаў ладзіць гаспадарку:

У тым кутку, глухім і дзікім,
Стараннем дзядзькавым вялікім
І цяжкай працай хлебароба
Набыта розная надоба;
Ўсё зацвіло, загаманіла,
Бы жыватворчая тут сіла
Ад сну прыроду абудзіла...

Не ўспеў Міхал з сваёй сям'ёю
І пяць гадкоў спазнаць спакою,
Як сталі чуткі пачувацца —
Ляснічы сам даваў намёкі —
Праз час не вельмі так далёкі
Ў другі куток перабірацца.

Коласаў бацька, як сведчаць архіўныя дакументы, пераехаў з Сухошчыны ў Альбуць у красавіку 1890 года.

## АЛЬБУЦЬ

На поўнач ад Мікалаеўшчыны, у 5-ці км ад яе, на ўзлеску перад лугам, стаіць хата з гаспадарчымі будынкамі: гумном, хлявом і прыгрэбнікам. Гэта леснікова пасада Альбуць у былых угоддзях князя Радзівіла. Альбуць апісана Коласам у «Новай зямлі» пад назвай Парэчча. Перад пасадай з лесу цячэ крынічка, праз якую сёння пабудаваны мосцік. Мосціка ў той даўні час не было, а ляжалі доўгія жэрдкі — кладка, па якой пераходзілі рэчку, а ездзілі ўброд:

Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка,
Абодва берагі каторай
Лазняк, ракітнік абступалі;
Бруіліся ў цяньку іх хвалі
І ў луг чуць значнаю разорай
Ішлі спакойна між чаротаў,
Рабілі многа заваротаў,
Аж покі ў Нёман не ўцякалі.

Гэта «родны кут» вялікага песняра беларускага народа Якуба Коласа. Леснікова пасада Альбуць з яе прыгожай навакольнай прыродай захавалася ў нашы дні ў такім

жа выглядзе, калі ў сям'і бацькі, лесніка Міхала, праходзілі гады дзяцінства і юнацтва Кастуся. З той толькі розніцай, што ў даўнейшай Альбуцi было больш балотаў, азёр, зайцоў, лісаў, ваўкоў, ласёў і бясконцае мноства дзікага птаства.

30 красавіка 1891 года хата згарэла па невядомых прычынах. Сёння пасада Альбуць агароджана па-даўнейшаму, як агароджана і тая частка лесу, адкуль цякла ў бок леснiковай пасады крыніца. У той час тут быў звярынец, дзе трымалі козы-даніелькі для пацехі магнатаў Радзівілаў.

Альбуць дала будучаму паэту шмат уражанняў, якія паслужылі багатым матэрыялам для напісання паэмы «Новая зямля». Здарэннi, усе праявы сялянскага жыцця, служба леснікоў па ахове княжацкіх лясоў, усе дзейныя асобы паэмы не прыдуманыя: усё апісанае ў «Новай зямлі» мела месца ў жыцці.

Альбуць — адна з чатырох леснiковых пасад, у якой Коласаваму бацьку Міхалу і яго сям'і давялося пажыць больш, чым ва ўсіх іншых. З 20 гадоў і 10 месяцаў службы Міхала ў якасці лесніка князя Радзівіла 11 гадоў і 9, 5 месяцаў прыпадаюць на Альбуць, якая з'явілася яго апошнім месцам працы. Службу ў Альбуцi Міхал Міцкевіч прыняў 22 красавіка 1890 года і працаваў да канца жыцця. Памёр Міхал 8 лютага 1902 года. Пасля смерці бацькі леснікам у Альбуцi быў прызначаны старэйшы брат Коласа Уладзя, які праслужыў тут два гады. Затым ён быў пераведзены на камору ў Цёмныя Ляды, куды пераехала і ўся сям'я Коласа. Сам Якуб Колас, пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі ў 1902 годзе, працаваў настаўнікам на Палессі.

Хутка Уладзя быў звольнены. Сям'я маці пераехала ў Мікалаеўшчыну. Жылі ў княжацкай карчме. Дзядзька Антось апрацоўваў карчомную зямлю, якая знаходзілася ў Смольні, дзе раней была смалярня князёў Радзівілаў. У 1910 годзе вясною ў Мікалаеўшчыне здарыўся нечаканы пажар. Згарэла паўсяла і карчма, дзе жылі родныя Якуба Коласа. Было вырашана не будавацца ў сяле, а пабудавацца на арандаванай княжацкай зямлі далей ад вёскі. Дзядзька Антось атрымаў дазвол ад князя Радзівіла і пабудаваў сядзібу ў Смольні.

## СМОЛЬНЯ

Будаўніцтва хаты было закончана да лета 1911 года. Якуб Колас у гэты час сядзеў у Мінскім астрозе за арганізацыю і ўдзел у



*Хата на сядзібе ў Смольні. Летам 1912 г. тут упершыню сустрэліся Якуб Колас і Янка Купала.*

нелегальным рэвалюцыйным настаўніцкім з'ездзе 9 ліпеня 1906 года, які праходзіў на Прыстаньцы каля в. Мікалаеўшчыны. Пасля выхаду з турмы ў верасні 1911 года Якуб Колас у першы раз прыехаў у Смольню. Тут ён пасадзіў ліпы, якія растуць і цяпер. У Смольні летам 1912 года адбылася першая сустрэча Якуба Коласа і Янкі Купалы, якая дала пачатак вялікай дружбе двух народных паэтаў.

У Смольні Якуб Колас бываў наездамі ў 1911—1914 гг. Даводзілася бываць Коласу на сядзібе і ў пазнейшыя часы. Да 1939 года Якуб Колас не мог прыехаць у свой родны кут, які ўваходзіў у склад Польшчы. Змог прыехаць у Смольню і Мікалаеўшчыну толькі ў 1940 годзе, калі ў Мікалаеўшчыне ў чарговы раз здарыўся вялікі пажар (згарэла ўся вёска). Якуб Колас як мог паспрыяў адбудове вёскі і новай школы. Але будаўніцтва было перапынена вайной. У часе вайны Якуб Колас быў у эвакуацыі ў г. Ташкенце. Пасля вайны ён часта прыязджаў у Мікалаеўшчыну з заездамі ў Смольню. Ён так пісаў у сваім дзённіку пад датай 2 чэрвеня 1947 года: «З раніцы ездзілі ў Смольню. Слаўная мясціна. Тыя ж будынкі, што будаваў мой дзядзька Антось. Будынкі, у якіх жыла мая маці і даглядала іх. На гумне агромнае буслава гняздо з бусламі. Ліпы мае так разрасліся, што просяць кісці мастака-пейзажыста. Проста не верыцца, што я саджаў іх 36 гадоў таму назад і так паразрасталіся яны за гэты час…»

Прайшло 125 гадоў з дня народзін народнага песняра Беларусі, але не зарастае сцяжына ў родны кут паэта. На яго радзіме дзейнічаюць 4 філіялы Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа: Акінчыцы, Ласток, Альбуць і Смольня.

У Мікалаеўшчынскай СШ імя Якуба Коласа ў мінулым годзе быў арганізаваны школьны этнаграфічна-літаратурны музей «Спадчыны куток». Адкрыццё яго было прыўрочана да 140-годдзя школы.

***Соф'я МІЦКЕВІЧ,***
***загадчыца філіялаў музея Якуба Коласа.***